# УГОЛАС І САМ САБЕ. ДВА ВІДЫ ЧЫТАННЯ Ў ПАЧАТКОВАЙ ШКОЛЕ

*М.І. Сянкевіч*

Паводле метадычных рэкамендацый, уласна чытанне на ўроку павінна займаць 30 – 40 хвілін. Для таго, каб у малодшых школьнікаў паспяхова сфарміраваліся чытацкія навыкі, неабходна многа разоў звяртацца да тэксту, перачытваць яго з усё новымі заданнямі. І кожны раз вучань павінен адкрыць для сябе нешта новае, тое, чаго ён не прыкмеціў пры першасным успрыманні тэксту. Праблема менавіта ў тым і заключаецца, каб незаўважна для вучня "прымусіць" яго чытаць многа.

На жаль, на ўроках літаратурнага чытання нярэдка можна пачуць ад неспрактыкаванага настаўніка ці студэнта-практыканта: чытай далей, чытай яшчэ раз, дома перачытайце апавяданне два ці тры разы... Гэта адбываецца па той прычыне, што педагог не ў дастатковай меры валодае прыёмамі работы над тэкстам, не задзейнічае замацаваныя ў практыцы навучання спосабы чытання.

Усе віды чытання, якія прымяняюцца ў пачатковай школе, можна падзяліць на дзве асноўныя групы:

а) чытанне ўголас;

б) чытанне сам сабе.

За адным разам хочацца заўважыць, што "чытаць пра сябе" (надзвычай распаўсюджаная моўная памылка) вучань можа толькі ў тым выпадку, калі ён стаў героем газетнай ці часопіснай замалёўкі У якасці сінонімаў да спалучэння слоў "чытай сам сабе" мэтазгодна карыстацца выразамі "чытай вачыма", "чытай моўчкі".

Чытанне ўголас прымяняецца ва ўсіх чатырох класах для фарміравання чатырох асноўных яго якасцяў: правільнасці, свядомасці, бегласці і выразнасці. Несумненна, што ў першым і другім класах чытанне ўслых будзе пераважаць, бо, калі вучні чытаюць вачыма, настаўнік не здолее кантраляваць, наколькі паспяхова ідзе фарміраванне навыку.

Існуюць наступныя віды чытання ўслых:

а) чытанне твора цалкам настаўнікам або спецыяльна падрыхтаваным вучнем;

б) чытанне твора "ланцужком";

в) выбарачнае чытанне з мэтай адказу на пытанне настаўніка;

г) чытанне па ролях;

д) харавое чытанне

е) "вулей" – кожны вучань чытае ўпаўголаса ў звыклым для сябе тэмпе.

*Выразнае чытанне твора цалкам* праводзіцца, як вядома, з мэтай азнаямлення навучэнцаў са зместам тэксту. У першым і другім класах гэта звычайна робіць настаўнік, а ў трэцім і чацвёртым – спецыяльна падрыхтаваны па дамоўленасці з ім вучань. Адпаведнае заданне настаўнік можа запісаць у вучнёўскі дзённік, каб забяспечыць кантроль з боку бацькоў.

Першаснае чытанне твора – адзін з найбольш адказных этапаў урока, ад якога ў многім залежыць ягоны поспех.

*Чытанне ланцужком* вядзецца пры паўторным чытанні тэксту, а таксама пры праверцы дамашняга задання. Яго мэта – уключыць у працэс як мага больш вучняў.

Названы від чытання ўслых прымяняецца да мастацкіх апавяданняў і казак. Важна правільна арганізаваць гэтую працу. Па-першае, у працэс па чарзе павінны ўключацца дзеці, у якіх чытацкія навыкі сфарміраваны на дастаткова высокім узроўні і тыя, хто чытае павольна, няўпэўнена. Лідары задаюць тэмп, а ўсе астатнія імкнуцца прыкласці намаганні, каб вытрымаць яго. Паколькі працяглы час з пастаўленай задачай ім спраўляцца цяжка, то і аб'ём тэксту такім вучням трэба прапаноўваць невялікі.

Па-другое, каб у вучняў, для прыкладу, апошняга рада не ўзнікала спакусы адключыцца ад працэсу чытання, пакуль не наблізіцца іх чарга, настаўніку лепш называць імёны дзяцей у адвольным парадку. У пачатковых класах не рэкамендуецца выкарыстоўваць апісаны прыём пры праверцы завучанага на памяць, бо ў такім выпадку не можа весціся гаворка пра выразнае чытанне твора.

*Выбарачнае чытанне з мэтай адказу на пытанне настаўніка* патрабуе спецыяльнай падрыхтоўкі. Папярэдне вучні чытаюць моўчкі ці праглядаюць твор або некалькі твораў (звычайна, на абагульняльных уроках) і пазначаюць алоўкам адпаведныя месцы.

*Чытанне па ролях* можа прымяняцца пры праверцы дамашняга задання, пры паўторным перачытванні тэксту. Яно карыснае ў тым плане, што дапамагае вучням глыбей адчуць характар персанажа менавіта праз яго мову. Перад вучнем узнікае неабходнасць выбраць правільны тэмп чытання, абазначыць голасам лагічныя паўзы і націскі, перадаць эмацыянальны змест рэплікі. А ўсё гэта будзе зроблена правільна, калі ён зразумее характар героя. Чытанне па ролях выкарыстоўваецца як у працэсе аналізу мастацкіх твораў (асобныя дыялогі), так і пасля высвятлення ідэйна-эстэтычнага зместу твора. Яно патрабуе *абавязковай* падрыхтоўкі. Кожны вучань павінен ведаць *што* яму чытаць і *як* чытаць.

Рыхтуючы клас да чытання па ролях, настаўнік выступае як рэжысёр і пачынае сваю працу з таго, што абмяркоўвае з дзецьмі характары вобразаў-персанажаў. Пасля гэтага трэба выбраць выканаўцаў адпаведных роляў. Педагог можа зрабіць гэта сам, а можна выкарыстаць дапамогу класа, бо дзеці ведаюць, хто лепш, чым іншыя, івыканае ролю зайца, лісы, воўка ці іншых персанажаў. Затым даецца пяць-сем хвілін на падрыхтоўку. Чытальнікі адзначаюць у падручніку свае рэплікі, рыхтуюцца вымаўляць іх услых. Толькі пасля гэтага мэтазгодна пачынаць «рэпетыцыю». Чытальнікі-дублёры прапануюць свае варыянты «агучвання» роляў.

Для чытання па асобах бярэцца не ўвесь тэкст, а толькі яркая, эмацыянальная частка яго. Як вядома, дыялог звычайна суправаджаецца словамі аўтара, у якіх падаюцца парады, як вымаўляць адпаведную рэпліку.

Пры чытанні па ролях аўтарскія словы выключаюцца з тэксту, не чытаюцца, але яны дапамагаюць вучню правільна выканаць сваю ролю.

Чытанне па асобах блізка стаіць да *драматызацыі* тэксту, калі дзеці выконваюць ролі, не карыстаючыся падручнікамі. Для драматызацыі лепш за ўсё падыходзяць казкі. Пры выкананні сваіх роляў дзеці задзейнічаюць маскі, асобныя элементы касцюмаў, якія, дарэчы, можна з поспехам падрыхтаваць на ўроках працоўнага навучання.

*Харавое чытанне* ў пачатковых класах не павінна прымяняцца асабліва часта, бо яно не дае магчымасці выявіць сфарміраванасць тэхнікі чытання ў кажнага вучня. Чытаць хорам карысна пры завучванні вершаў на памяць. Каб разнастаіць гэты від працы, настаўнік мае магчымасць (калі гэта не супярэчыць зместу твора) “узмацняць” ці “паслабляць” гучнасць. Гэта значыць, з кожнай новай страфой колькасць чытальнікаў павялічваецца ці, наадварот, змяншаецца. Па ўмоўным сігнале педагога вучні могуць чытаць максімальна гучна, упаўголаса, шэптам і моўчкі, толькі імітуючы артыкуляцыю.

*“Вулей”,* як сведчыць практыка, найлепш выкарыстаць пры паўторным чытанні твора, калі дайшла чарга да апошняй часткі. Пад час такога чытання-гудзення настаўнік мае магчымасць падысці да асобных вучняў, каб паслухаць іх. “Вулей” абавязкова павінен гучаць на ўроках пісьма ў перыяд навучання грамаце, а таксама на ўроках мовы ў другім класе і нават трэцім класах, бо вучні, у адпаведнасці з прынятай методыкай, спісваць з кнігі і з дошкі, а таксама запісваць пачутае, дыктуючы сабе “арфаграфічна” па складах.

*Маўклівае чытанне* прымяняецца ва ўсіх класах пасля навучання грамаце. Яно суправаджаецца рознымі заданнямі, якія накіраваны на фарміраванне такіх якасцяў як бегласць, свядомасць, падрыхтоўка да выразнага і правільнага чытання. Прывядзём спачатку некалькі практыкаванняў на выпрацоўку бегласці.

1. Прачытаць словы вачыма, вымаўляючы ўслых толькі назвы свойскіх жывёл (птушак):

алень, лось, конь, зубр, карова
сабака, кот, лісіца, вожык, каза
зубр, свіння, трус, воўк, авечка

2. Прачытаць словы моўчкі і тут жа назваць таго, хто выконвае названае дзеянне:

мурлыкае, гаўкае, шыпіць, пішчыць
вые, фаркае, каркае, кудахча
цвыркае, кукуе, спявае, квакае
кракае, гагоча, рохкае, курлыча

3. Даюцца рады слоў, што абазначаюць частку прадмета. Трэба (хто хутчэй!) назваць сам прадмет:

кузаў, кабіна, фары – аўтамабіль
крылы, галава, шыя – птушка
ствол, карэнне, лісце – дрэва

4. Практыкаванне “Буксір”. Настаўнік гучна чытае тэкст. Дзеці сочаць моўчкі і стараюцца не адстаць. Педагог можа наўмысна зрабіць памылку, якую дзеці павінны заўважыць. Вачыма чытаць хутчэй і вучні ў такім разе не адстаюць.

5. «Імгненнае чытанне». Тэкст адкрываецца на пэўны прамежак часу. Вучні імкнуцца прачытаць і запомніць напісанае.

Пры падрыхтоўцы да выразнага чытання можна выкарыстаць наступныя заданні, звязаныя з чытаннем сам сабе:

– пошук ключавых слоў, словазлучэнняў і сказаў, якія нясуць найбольшую сэнсавую нагрузку ў тэксце;
– падрыхтоўка да чытання па ролях;
– разметка тэксту і складанне партытуры.

Пры фарміраванні навыкаў свядомага чытання таксама нельга абысціся без чытання вачыма. Яно выкарыстоўваецца найперш пры выкананні самых розных заданняў на ўзнаўленне тэксту.

Назавём асобныя з іх:

– маўклівае чытанне тэксту з мэтай падрыхтоўкі адказу на пытанні настаўніка і падручніка;
– маўклівае чытанне тэксту з мэтай падбору цытатных загалоўкаў у якасці пунктаў плана;
– чытанне сам сабе з мэтай адбору матэрыялу для характарыстыкі персанажаў;
– чытанне з мэтай падрыхтоўкі для пераказу і інш.

Амаль заўсёды чытанню ўслых павінна папярэднічаць чытанне вачыма. Дарэчы заўважыць, што ні адзін майстар-чытальнік, ніводзін аўтарытэтны дыктар не возьмецца агучваць тэкст, папярэдне не прачытаўшы яго сам сабе моўчкі ці ўпаўголаса.

Вялікую памылку дапускаюць тыя настаўнікі, якія спецыяльна не навучаюць малодшых школьнікаў чытаць вачыма. Адсутнасць дадзенага навыку пажыццёва тармозіць свядомае разуменне матэрыялу. Той, каго не навучылі чытаць вачыма, пры жаданні запомніць матэрыял, чытае ўголас, значыць, “чытае вушамі”. У такой сітуацыі дзеці не толькі зрокава ўспрымаюць тэкст, але і слухаюць. Моўны апарат не выключаны поўнасцю (рухаюцца губы і язык). Між тым, з уключаным моўным апаратам немагчыма чытаць хутка. Каб “адключыць” яго, трэба параіць навучэнцам прыкласці да вуснаў указальны палец або злёгку прыкусіць (у прамым сэнсе слова) кончык языка.

У заключэнне яшчэ раз акцэнтуем увагу на тым, што два названыя віды чытання (услых і сам сабе) павінны ўзаемна дапаўняюць адзін аднаго і разумна чаргавацца на ўроку.